**УДК 72.05:296.735(476.6)**

# ПОМНІКІ МУРАВАНАГА ДОЙЛІДСТВА ПАЎНОЧНАЙ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 20 СТ. У ТУРЫСТЫЧНА-ЭКСКУРСІЙНЫМ ПАКАЗЕ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Артыкул прысвечаны архітэктуры паўночнай Гродзеншчыны і культаваму дойлідству на яе тэрыторыі як унікальнай з'яве ў гісторыі айчыннай культуры, што адлюстравала духоўны патэнцыял, мастацкія ўплывы і тэхнічныя магчымасці першай паловы 20 стагоддзя.*

За часы існавання беларускі народ пакінуў выдатную і самабытную спадчыну. Архітэктура з'яўляецца яе састаўной часткай і займае сярод помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры асобнае месца. Менавіта ў архітэктуры больш, чым у якой іншай сферы чалавечай дзейнасці, адлюстравана гісторыя чалавецтва не толькі яго ідэалогія, сацыяльна-палітычнае жыцце, але і эканамічнае развіцце грамадства.

У пачатку 20 ст. Заходняя Беларусь была занятая нямецкмі войскамі а пазней, калі ўвайшла ў склад Польшчы, стала рэгіёнам, дзе працягвалі развівацца традыцыі храмавага будаўніцтва і апрабоўвацца новыя еўрапейскія стылі. Да 1929 года, культавая архітэктура ў гэтым краі перажыла і ўнутраную стылістычную эвалюцыю, і адчула на сабе агульнаеўрапейскія архітэктурна-мастацкія ўплывы.

Першая сусветная вайна, акупацыя нямецкай арміяй і войскамі Польшчы не перарвалі ў Заходняй Беларуа развіццё культавай архітэктуры, што набірала ўсё больш дынамізму ў пошуках арыгінальных форм і вобразаў, якія, з аднаго боку павінны былі адпавядаць кананічным асаблівасцям адпаведнага культу, а з другой - адлюстраваць індывідуалістычную сутнасць культуры XX ст.

Істотным фактам фарміравання архітэктуры ў 20-30 гады 20 ст. з'яуляюцца багатыя нацыянальныя традыцыі дойлідства. Менавіта ў гэты перыяд зараджаецца практыка рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў на строга навуковай аснове. Так, да прыкладу, быў адноўлены воблік фарнага касцёла ў Гродна (XV ст.), касцёла ў Гнезне (XV–XVI стст.), праведзена кансервацыя Лідскага, Крэўскага і Навагрудскага замкаў [1].

Адначасова працягваюць плённа развівацца рэгіянальныя школы народнага драўлянага дойлідства (асабліва ў Паазер'і на Палессі), працягваючы шматвяковыя мясцовыя традыцы). Гэта паўплывала і на фарміраванне нацыянал-рамантычнай плыні ў заходнебеларускіх землях, у якой у гэтыя гады наметіўся адыход ад умоўна-рэтраспектыўных прыёмаў перыяду мадэрна да стварэння вобраза храма, імкнення найбольш поўна і магутна ўвасобіць мясцовыя гістарычныя і мастацкія традыцыі. Цягам 1915–1940 гг. культавае дойлідства Заходняй Беларусі як і архітэктура наогул, перажыло некалькі этапаў стылістычнай і тэхнічнай эвалюцыі.

Першы этап, што цягнуўся ад пачатку 20 ст. і лагічна, і эвалюцыйна звязаны з агульнарасійскімі тэндэнцыямі, характарызуецца імклівым ростам колькасці сакральных пабудоваў у рэтраспектыўным духу гістарызму. Гэты этап характарызуецца вялікай колькасцю аб'ектаў, пабудаваных у розных неастылях - неагатычным, неарускім, неакласіцыстычным [2]. Яскравымі прыкладамі гістарызму з'яўляюцца такія аб'екты, як касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты Астравецкага раёна (мал. 1), касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец, касцёл Маці Божай Добрай Рады ў в. Нястанішкі, касцёл Прасвятой Троіцы ў аг. Войстам, касцёл Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Смаргонскага раёна, касцёл Святога Міхаіла Арханёла горада Ашмяны і інш.

Касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты Астравецкага раёна – адзін з найлепшых узораў так званых гістарычных стыляў у Беларусі, што выяўлялі нацыянальныя тэндэнцыі рамантызму: Троіцкі касцёл ўвасабляе вертыкальную дынаміку і ўзнёсласць формаў. Касцёл пабудаваны ў 1899–1903 гг. у чыстым неагатычным стылі.

Велічная трохнававая крыжовая базыліка касцёла з узнёслай спічастай вежай на галоўным фасадзе дамінуе над навакольным асяроддзем. Перакрыжаванне роўнавысокіх двухсхільных дахаў цэнтральнай навы і трансепта, якія ўтвараюць у плане праграмны лацінскі крыж, увенчвае вастраверхая сігнатурка. Вільчыкі дахаў аздабляе шчыльны шэраг фіялаў-трохлістнікаў, накшталт "крабаў" сапраўднай еўрапейскай готыкі. Асноўным сродкам стварэння мастацкай выразнасці архітэктуры святыні з'яўляецца гарманічнае ўзаемадзеянне вертыкальных і гарызантальных рытмаў, стральчатых і прыступчатых формаў.



Мал. 1. Касцёл Святой Троіцы ў в. Гервяты

Адносна тонкія сцены храма рытмічна ўмацоўваюць прыступчатыя контрфорсы і аркбутаны, якія таксама імітуюць канструкцыйную сістэму сярэднявечнай французскай готыкі, але маюць сваё адметнае і непаўторнае пластычнае і колеравае вырашэнне. Прамавугольныя ў плане контрфорсы па вертыкалі складаюцца з трох ярусаў, накрытых двухсхільнымі дашкамі. Плоскаці контрфорсаў апрацаваны стральчатымі і прамавугольнымі нішамі, выцягнутымі па вертыкалі. Яны паступова змяншаюцца па памерах і завершаны высокімі пінаклямі з фіяламі. Усё гэта стварае незвычайны, востры і крыху нервовы малюнак архітэктурных формаў. Сегменты аркбутанаў на тарцах бакавых наваў запоўнены стральчатай аркадай, якую ніжэй падкрэслівае аркатурны пояс, аздоблены трылíснікамі. Абрысы аконных праёмаў таксама стральчатыя, з вялікай стралой пад’ёма арак. Тарцы трансепта падзелены вертыкальнымі і гарызантальнымі цягамі, што стварае своеасаблівы каркас – нібыта «каменны дождж».

На галоўным фасадзе цэнтральнай навы сканцэнтраваны разнастайныя элементы гатычнай архітэктуры. Уваходны партал у выглядзе перспектыўнай стральчатай аркі аформлены вімпергам. Ядро кампазіцыі фасада займае вялізнае акно-ружа. Верхні ярус квадратнай у плане вежы-званіцы зроблены скразным і візуальна лёгкім. Яго завяршае вастраверхі шацёр з крыжам, які імкліва ўзносіцца ўгору. Па баках вежы прыбудаваны два невялікія аб’ёмы з вітымі ўсходамі, звонку выразна падкрэсленыя шматпрыступчатымі контрфорсамі з аркбутанамі і пінаклямі, што надае галоўнаму фасаду ўзмоцненую вертыкальную дынаміку. Будынак пастаўлены на невысокі цокаль з гранітных блокаў. Па баках кароткага прэзбітэрыя з плоскай алтарнай сцяной у адну лінію з навамі ўкампанаваны сіметрычныя, квадратныя ў плане закрыстыі. Асаблівую маляўнічасць вонкаваму абліччу касцёла надае кантрастнае спалучэнне адкрытай муроўкі з чырвонай цэглы і атынкаваных дэкаратыўных дэталяў.

Інтэр'ер Гервяцкага касцёла св. Троіцы ўражвае канструкцыйнай логікай, яснасцю і мастацкай выразнасцю архітэктуры. Усе архітэктурныя формы вызначаюцца выцягнутасцю прапорцый па вертыкалі. Пяць пар складанапрафіляваных апор з высокімі васьміграннымі п'едэсталамі падзяляюць прастору на 3 светлыя нефы, перакрытыя крыжовымі нярвюрнымі скляпеннямі з падпружнымі аркамі стральчатага абрысу [3]. Вышэй міжнефавых аркад па баках цэнтральнага нефа праходзіць дэкаратыўны пояс эмпор. Алтарныя кампазіцыі і амбон выкананыя ў стылі неаготыкі і завершаныя вастраверхімі пінаклямі. У аконных праёмах па баках трох'яруснага галоўнага алтара ацалелі фрагменты вітражоў. Над уваходам на двух апорах размешчана двух'ярусная галерэя арганных хораў, у плане парабалічнай формы, што пашырае прастору цэнтральнага нефа.

Выказам агульнага ацэньвання прыгажосці і каштоўнасці касцёла стаў выпуск маркіраваных канвертаў з выявай касцёла св. Тройцы ў в. Гервяты рэспубліканскім дзяржаўным аб'яднанне «Белпошта» [4].

Касцёл Маці Божай Добрай Рады ў в. Нястанішкі – помнік архітэктуры неаготыкі. Касцёл знаходзіцца за 2 км на захад ад вёскі. Пабудаваны ў 1905 г. (мал. 2).

Першы драўляны на каменным падмурку касцёл Святой Троіцы ў Нястанішках быў закладзены ў 1497 г. Багданам Андрэевічам дэ Паніжан. Ён быў уладальнікам маёнтка Паніжаны, размешчанага недалёка ад Нястанішак.



Мал. 2. Галоўны і бакавы фасады касцёла Маці Божай Добрай Рады ў в. Нястанішкі

У 1905 г. быў закладзены фундамент новага мураванага касцёла ў 100 сажанях ад старога драўлянага касцёла, пры парафіяльных могілках. У 1911 г. будаўніцтва, якое вялося на сродкі парафіян, было скончана, і 10 ліпеня 1912 г. кс. Казімір Валюнас, свірскі дзекан, асвяціў касцёл пад новым тытулам – Найсвяцейшай Панны Марыі Добрай Рады. Кансэкраваў новы касцёл у 1928 г. віленскі арцыбіскуп Рамуальд Ялбжыкоўскі. Так з’явілася велічная неагатычная святыня з вонкавай чырвонай цэглы, дзвюхвежавая з трансэптам і пяціграннай апсідай, якую фланкуюць 2 сакрыстыі. Касцёл быў накрыты адзіным двухсхільным бляшаным дахам (у 2003 г. заменены на метала-чарапіцу) з вальмамі над апсідай і двухсхільнымі дахамі над крыламі трансепта. Галоўны фасад фланкуюць высокія і магутныя чатырох’ярусныя чацверыковыя вежы-званіцы, завершаныя спічакамі з падрэзанымі вугламі. Інтэр’ер, падзелены васьмю калонамі на 3 навы і перакрыты стрэльчатымі і крыжовымі скляпеннямі, упрыгожваюць 3 драўляныя алтары: галоўны алтар Найсвяцейшай Панны Марыі Добрай Рады ( прыклад стылю неаготыкі – двух’ярусны, у цэнтры патранальны абраз, акружаны фігурамі св. апосталаў Пятра і Паўла, наверсе – фігура Езуса Міласэрнага, завяршаюць кампазіцыю шматлікія пінаклі і фіялы рознай велічыні), левы бакавы св. Юрыя і правы св. Ізідара – апекуна земляробаў. Апошні алтар асабліва цікавы. Ён упрыгожаны атрыбутамі сялянскай працы: малацілкамі, косамі, граблямі і г.д, снапамі пшаніцы і нават разьбянымі галовамі кароў. Алтар св. Ізідара фундавны Мацільдай Бучыньскай, абраз намаляваны віленскім мастаком Карчэўскім. У алтары змешчаны і рэліквіі святога, прывезеныя з Мадрыда 10 ліпеня 1905 г. Бакавыя дзвюхкалонныя двух’ярусныя алтары выкананы ў стылі “станіславаўскага класіцызму”, але яны не аднолькавыя і, магчыма, перанесеныя з былога касцёла. Над уваходам зроблены хоры з арганам. У маі 2004 г. з Рыма ў касцёл дастаўлены абраз і рэліквіі бл. Аўгуста Чартарыйскага.

Перад Другой сусветнай вайной колькасць парафіян дасягала амаль 4000 чалавек. Нястанішская парафія да 1991 г. уваходзіла ў склад Свірскага дэканата. [5]

Касцёл дзейнічае і сёння, з 1970-х гг. мае статус помніка архітэктуры. Касцёльная тэрыторыя абнесена высокім бутавым мурам, галоўны ўваход пазначаны брамай у выглядзе чатырох цагляных слупоў.

Асноўнай славутасцю горада Ашмяны з'яўляецца касцёл Святога Міхаіла Арханёла (мал. 3), які быў пабудаваны тут у 1910 годзе. Касцёл у горадзе Ашмяны – помнік архітэктуры неабарока. 3-нефавая 2-вежавая базіліка з 5-граннай апсідай і бакавымі сакрысціямі. Мае ярусную аб’ёмна-прасторавую кампазіцыю. Цэнтральны аб’ём накрыты 2-схільным дахам, расчлянёны лучковымі аконнымі праёмамі ў пластычных ліштвах і фігурна прафіляваных нішах з пілястрамі ў прасценках, апяразаны складанапрафіляваным карнізам. Ніжэйшыя бакавыя нефы пад 1-схільнымі дахамі расчлянёны здвоенымі лучковымі аконнымі праёмамі ў агульных арачных ліштвах са здвоенымі пілястрамі ў прасценках. Галоўны фасад фланкіраваны высокімі 5-яруснымі шатровымі вежамі з лучковым шчытом і бакавымі валютамі паміж імі, у цэнтры вылучаны высокімрызалітам з 3-вугольным франтонам у завяршэнні і лучковым уваходным парталам. Бакавыя нефы на галоўным фасадзетаксама завершаны фігурнымі шчытамі з валютамі і вуглавымі пінаклямі. Фасады атынкаваны. Унутры нефы перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі.

Касцёл у горадзе Ашмяны знаходзіцца ў выдатным стане і функцыянуе, ён з'яўляецца беларускім архітэктурным помнікам пачатку 20 ст., гісторыка-культурнай каштоўнасцю і важнай славутасцю Беларусі.



Мал. 3. Галоўны фасад касцёла Святога Міхаіла Арханёла ў г. Ашмяны

Архітэктурныя помнікі, што атрымала Беларусь у 20 ст., амаль палову якога яна была падзелена, існуючы ў дзвюх розных палітычных, сацыяльных і культурных сістэмах, - гэта ўнікальны досвет нашай гісторыі. Вялікая колькасць культавых помнікаў мінулага стагоддзя, што захаваліся да нашых дзён ў Заходняй Беларусі, актыўна фарміруюць і вобраз, і структуру населеных пунктаў. Іх вывучэнне, класіфікацыя, даследаванне стылістычных уплываў з'яўляецца актуальным і на сённяшні дзень.

ЛІТАРАТУРА

1. Архітэктура Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Архітэктура_Беларусі#. – Дата доступу: 28.09.2016.
2. Беларускае дойлідства [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1045689101&archive=refcul1126090284&start_from=&ucat=&. – Дата доступу: 28.09.2016.
3. Архітэктура Беларусі : энцыклапед. даведнік / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с. ; іл.
4. Аляксеева, Н. Падарунак да юбілею / Н. Аляксеева // Аставецкая праўда. – 2003. – № 1385.
5. Нястанішкі [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://slowo.grodnensis.by/index.php?option=com_content&view=article&id=2799%3A7-371&catid=12%3Aparafii-i-swiatynie&Itemid=430&lang=by– Дата доступу: 28.09.2016.